| Вопросы и учебные задания | Формируемое метапредметное умение (ведущее, ключевое) | Описание вариантов ответов |
|---|---|---|
| | Учебные задания | |
| 1. Обведите рамки с рисунками, на которых изображены главные герои рассказа | Умение извлекать из прочитанного текста информацию, заданную в явном виде | Обведены рамки с рисунками «мышь», «лев» |
| 2. Определите последовательность событий. Что было сначала, что потом? Обозначьте цифрами 1, 2, 3 | Умение извлекать из прочитанного текста информацию и сопоставлять ее с сюжетными рисунками, определяя последовательность событий | Указана правильная последовательность событий: 1 – лев поймал мышь; 2 – охотники поймали льва; 3 – мышь перегрызла верёвку |
| 3. Прочитайте пословицы. Отметьте знаком «+» все пословицы, которые подходят к содержанию рассказа | Умение сопоставлять информацию, полученную из разных источников; оценивать содержание высказываний | Знаком «+» отмечены пословицы: «Делай добро и жди добра», «Доброе дело без награды не остаётся», «На добрый привет добрый и ответ» |
| 4. Найдите и подчеркните в тексте все слова с буквой «ш» | Умение применять освоенные способы действия для решения учебно-практической задачи | Подчеркнуто 8 слов с буквой «ш» |
| 5. Придумайте ответ льва на последние слова мыши | Умение участвовать в групповой коммуникации, строить устное высказывание с опорой на полученную из различных источников информацию и личный опыт; прогнозировать развитие событий | Предложенные варианты ответа льва на слова мыши опираются на содержание рассказа и представления, основанные на личном опыте учащихся |



УДК 373.31

# ФАЛЬКЛОР ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ МАЎЛЕНЧА – КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

***Шылава А.С., Мурашка Н.У.***
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

*Анатацыя.* Праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў і інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій, якія спрыяюць эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечваюць дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці, а таксама фарміраванню вучэбнай дзейнасці малодшых школьнікаў.

*Ключавыя словы: маўленча-камунікатыўная-кампетэнцыя, фальклор, тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання.*

*Annotation.* The problem of formation of communicative competence at the 1st stage of General secondary education causes the need to find and implement new approaches and intensive educational technologies that contribute to the effective assimilation of knowledge and ensure the achievement of pre-designed results based on the interaction of actors, as well as the formation of educational activities of younger students.

*Keywords: communicative competence, folklore, technology of collective mutual learning.*

Адной з актуальных праблем на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў на ўроках беларускай мовы.

Пад тэрмінам «маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя» мы разумеем уменне карыстацца мовай у розных сітуацыях маўленчых зносін [1, с. 73].

Фармаванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў на ўроках беларускай мовы будзе больш эфектыўным, калі настаўнік у сваёй працы будзе ўлічваць фактары паспяховасці і эфектыўнасці яе фарміравання, прадстаўленыя намі на рысунку.

Сучасная педагогіка і псіхалогія ў якасці сродкаў фарміравання камунікатыўных уменняў і маўлення прапануе выкарыстоўваць гульнёвыя тэхналогіі. Гэта наводзіць нас думку аб выкарыстанні фальклору ў якасці сродку фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі. Пад тэрмінам «фальклор» мы разумеем як вусную народную творчасць, так сістэму каштоўнасцей народа і сістэму выхавання маладога пакалення.



Рысунак – Фактары паспяховасці і эфектыўнасці фармавання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі

Каштоўнасць фальклору як педагагічнага сродку вызначаецца:

– натуральным, беспрымусовым уздзеяннем на дзяцей дзякуючы сродкам выразнасці;

– даступнасцю для дзяцей з розным узроўнем развіцця;

– стымуляваннем развіцця творчых здольнасцей асобы;

– эмацыйна-эстэтычнай пераемнасцю паміж дарослымі і дзецьмі.

Сучасная адукацыя накіравана на эфектыўны пошук шляхоў, якія б спрыялі фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў, і, так сама, на выкарыстанне інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій.

Адной з такіх тэхналогій на нашу думку з'яўляецца тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання або калектыўны спосаб навучання А.Р. Рывіна, В.К. Дзьячэнкі [2, с. 41]. Аб выкарыстанні гэтай тэхналогіі ў навучальным працэсе падрабязна напісана ў даследаваннях В.К. Дзьячэнкі, А.С. Шылавай [3, с. 23-42]. Пакажам магчымасці вывучэння фальклорных твораў праз тэхналогію калектыўнага ўзаеманавучання на розных этапах урока беларускай мовы.

Кожны настаўнік пачатковых класаў мае свае варыянты пачатку ўрока, але мы прапануем больш творча падысці да гэтай часцы ўрока і з самага яго пачатку актыўна ўключаць вучняў у працу, папаўляючы іх слоўнікавы запас. Фальклор – гэта невычэрпная крыніца, якая дае нам шмат варыянтаў вітанняў, напрыклад:



– Маё вам прывітанне!

– Як вы жывы – дужы на гэтай сцюжы?

– З панядзелкам (аўторкам і г.д.) вас!

– Добры дзень добрым людзям! і г.д.

Зразумела, што з самага пачатку такая форма вітання, згодна з тэхналогіяй калектыўнага ўзаеманавучання, будзе мець групавую форму навучання, але паступова неабходна пераходзіць на парную форму.

Такую ж працу патрэбна праводзіць і на апошнім этапе ўрока, калі пасля падвядзення вынікаў урока настаўнік развітваецца. Тут, замест звычайнага «урок скончаны», можна развітвацца, напрыклад, з урокам беларускай мовы да наступнага раза. Прыкладам такога развітання можа быць:

– Да хуткай сустрэчы!

– Усяго найлепшага!

– Усяго добрага!

– Гладкай вам дарожкі! і г.д.

Выкарыстанне фальклорнага матэрыялу на астатніх этапах урока ў рамках тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання патрабуе грунтоўнай падрыхтоўкі настаўніка да кожнага ўрока. Настаўнік павінен падбіраць матэрыял так, каб ён дакладна адпавядаў мэце і задачам урока, тэме ўрока, узросту вучняў.

Актуалізацыя ведаў *і* ўменняў вучняў. Частка ўрока, дзе настаўнік узнауляе раней вывучаны матэрыял. Тут магчыма выкарыстанне прыказак і прымавак, загадак, у якіх зашыфраваны патрэбныя для настаўніка словы.

Для прыкладу возьмем тэму ўрока беларускай мовы 1 класа «Я і навакольны свет. Надвор'е, з'явы прыроды». На гэтым этапе ўрока мы можам выкарыстоўваць загадкі пра з'явы прыроды, або прыказкі і прымаўкі, у якіх гаворыцца аб іх.

Напрыклад, загадкі:

– Глянеш – заплачеш, а яму ўсе рады. (Сонца);

– Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць. (Гром) [4].

Ці прыказкі і прымаўкі:

– Завірухі і мяцелі ў лютым наляцелі;

– Хмары не будзе – гром не ўдарыць [4].

Пры выкарыстанні тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання на дадзеным этапе ўрока магчыма выкарыстанне ўсіх формаў арганізацыі навучальнага працэсу ад індывідуальнай да калектыўнай.

Маўленчая размінка. Для дадзенага этапу ўрока больш за ўсё падыходзяць скорагаворкі, якія так сама могуць выкарыстоўвацца ў тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання ў розных формах арганізацыі навучальнага працэсу.

Прыведзем прыклыды скорагаворак:

– Руды гарбаты Рыгор гроб грыбы граблямі;

– Ткач тчэ тканіну на хустку Антаніне [5, с. 117].

Тэхналогія калектыўнага ўзаеманавучання дае нам некалькі варыянтаў выкарыстання скорагаворак на дадзеным этапе ўрока. Тут можна выкарыстоўваць групавую і парную формы арганізацыі працы. Мэтазгодна пачынаць з парнай формы, паколькі яна з'яўляецца больш простай па арганізацыі і больш лёгкай для асваення вучнямі.

Вывучэнне новай тэмы. Гэтая частка ўрока павінна строга адпавядаць зместу вучэбнай праграмы. Безумоўна, выкарыстанне тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання тут магчыма і неабходна для інтэнсіфікацыі адукацыйнага працэсу. Паколькі нам цікавы магчымасці выкарыстання фальклорнага матэрыялу ў рамках тэхналогіі калектыўнага ўзаемавывучэння на ўроках беларускай мовы, а на гэтым этапе ўрока гэта не заўсёды з'яўляецца магчымым, то гэтую частку ўрока мы не будзем закранаць. Адзначым толькі, што, пры жаданні, для пераходу да вывучэння новага матэрыялу кожны настаўнік заўсёды можа знайсці свой спосаб фрагментарнага выкарыстання фальклорнага матэрыялу ў рамках дадзенай тэхналогіі.

Замацаванне вывучанага. На дадзеным этапе ўрока як нельга лепш падыдуць тыя віды работ, якія прапануюцца ў кнізе «Вучым радасна, паспяхова, з цікавасцю і ўсмешкай» [3, с. 23-42]. Аднак мы разгледзім іх зноў толькі з пункту гледжання выкарыстанне фальклорнага матэрыялу.

Для прыкладу прывядзем парную работу па напісанні ўзаемнай дыктоўкі, дзе адна група дыктуе пачатак прыказкі, прымаўкі або прыкметы, другая дапісвае яе заканчэнне і падкрэслівае зычныя гукі. Потым правяраюць і мяняюцца ролямі.

– Прыйдзе люты – спытае, (як абуты);

– У лютым востры мароз – (кароткая зіма) [5, с. 116].

У дадатак да вышэйапісаных відаў работ можна дадаць заданні, накіраваныя на развіццё маўлення. Для гэтага падыйдуць невялікія па аб'ёме казкі, небыліцы, загадкі.

Такім чынам, фальклорны матэрыял у рамках тэхналогіі калектыўнага ўзаеманавучання можа быць выкарыстаны на розных этапах урока беларускай мовы, што робіць урок больш займальным і цікавым для малодшых школьнікаў; інтэнсіўныя тэхналогіі навучання могуць стаць адным з выніковых сродкаў фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў.



*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Кузнецова, В. В. Коммуникативно-речевая компетенция – основа профессиональной культуры учителя / В. В. Кузнецова. // Человек и образование. – 2010. – № 2. – С. 71–73.
2. Интенсивное обучение: технологии организации образовательного процесса : практическое руководство / И. В. Шеститко [и др.]; рец. О. В. Клезович. – Светлая роща : ИППК МЧС Респ. Беларусь, 2014. – 136 с.
3. Шилова, Е. С. Учим радостно, успешно, с интересом и улыбкой. 1-4 классы : методическое пособие для учителей : в пяти книгах : книга 1 / Е. С. Шилова. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2017. – 136 с.
4. Барташэвіч, Г. А. Дзіцячы гульнёвы фальклор / Г. А. Барташэвіч // Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; навук. рэд. А. С. Фядосік. – Мінск, 2004. – 432 с.
5. На нова лета… : метадычныя распрацоўкі настаўнікаў этнашколы ў Сеніцы. – Мінск : Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, 2003. – 128 с.

---

УДК 372.4

# КАМПАНЕНТЫ МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

***Шыпіцына Д.***
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

*Анатацыя.* У артыкуле разглядаецца структура маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі

*Ключавыя словы: маўленча-камунікатыўная кампетэнцыі, малодшыя школьнікі.*

*Annotation.* The article discusses the structure of the voice-communication competence stage I on general education

*Keywords: speech, communicative competence, junior high school students.*

Адной з важнейшых задач пачатковай школы з'яўляецца рэалізацыя зместу праз інавацыйныя формы, метады, сродкі навучання, якія дазваляюць вырашаць адукацыйна-выхаваўчыя задачы на сучасным этапе навучання. Галоўным крытэрыем якасці адукацыі выступае сфарміраванасць пэўнага кола кампетэнцый, выкарыстанне якіх дапаможа навучэнцам у практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці. Па вызначэнні тэарэты-